4. Грицкевич А.П. Венский контресс 1515 // Франциск Скорина и его время: Энцикл.справочник. – Мн.: БелСЭ, 1990.
5. Грыцкевіч А.П. Гісторыя геапалітыкі Беларусі // Спадчына 1994. №1.
6. Вяроўкін-Шэлюта У.Інфлянты // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.3. Мн.: БелЭн., 1996.
7. Соколовский В. Утверждение исконного. Белорусская культура в немецкоязычном мире // Нёман 1995, №4.
8. Казуля С., Шалькевіч В. Лютэранства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.4. Мн.: БелЭН, 1997.
9. Казуля С. Кульва Аўраам //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.4. Мн.: БелЭН, 1997.
10. Сокал С.Ф.Волан Андрэй // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.2. Мн.: БелЭН, 1994.
11. Дарашкевіч Э.К., Пасэ У.С., Сянькевіч Г.Р., Ткачоў М.А., Трухан А.Б. Асвета // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.1. Мн.: БелЭН, 1993.
12. Грыцкевіч А.П. Саксонскае зярцала // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн.: БелСэ, 1989.
13. Капыскі З.Ю. Магдэбургскае права // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн.: БелСэ, 1989.
14. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.
15. Майснер А. Гісторыя асадніцтва і сучасныя праблемы немцаў Беларусі // Нацыянальныя меншасці Беларусі. Кніга 3. Актуальныя праблемы нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі. Брэст-Мінск, 1996.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІІ: ДА ПЫТАННЯ АБ СТАНЕ БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ

Коршак М.А.
*г. Брэст, БДУ імя А.С. Пушкіна*

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь увайшла ў склад Расіі. Перш за ўсё звернем увагу на геапалітычны аспект. "Тэрыторыя Беларусі ад канца XVIII ст. становіцца стратэгічным плацдармам для войнаў ў Еўропе, месцам сталага размяшчэння вялікіх кантынгентаў расійскай арміі і адначасова перадполлем на выпадак наступальнай вайны з боку праціўніка, каб затрымаць тут варожую для Расіі армію і пазбегнуць матэрыяльных і людскіх стратаў на тэрыторыі Расіі" [1,48].

Упершыню гэтая тэза знайшла пацвярджэнне ў час паходу Напалеона на Расію ў 1812 годзе. Вядома, што ў складзе падначаленага яму ваеннага кантынгента былі і немцы: 7-ы саксонскі корпус удзельнічаў у Кобрынскім баі, Гарадзечанскай бітве, ваяваў на айчыннай тэрыторыі і ў час адступлення напалеонаўскіх войскаў. Першапачатковая колькасць гэтага корпуса без малага раўнялася 17 тысячам чалавек.

Заўважым, што Напалеон распачаў паход на Расію, маючы ў якасці саюзнікаў усе шматлікія германскія дзяржавы.

Як бачым, зноў нага ўзброенага немца ступіла на беларускую зямлю. Праўда, пасля гэтага яе не будзе на нашай тэрыторыі аж да 1914 г. Дачыненні нямецкіх дзяржаў пасля аб'яднання краіны (1871 г., Германскай імперыі) да беларусаў нярэдка былі не на карысць апошніх. Перш за ўсё гэта тычылася пытання аб нацыянальна-дзяржаўным самавызначэнні Беларусі. У час паўстанняў 1830/31 гг. і 1863/64 гг. у Польшчы і на Беларусі рэакцыя Прусіі была такой: "Беларусь і Літва лічыліся "рускімі губернямі" і ў дыпламатычны разлік увогуле не браліся ..." [1, 51].

"У XIX стагоддзі з адраджэннем духоўнага жыцця на Беларусі паступова адбываецца новае знаёмства з яе культурай ... у Германіі. Гэтаму садзейнічалі пэўныя працэсы як у

самой Беларусі ( станаўленне новай літаратуры, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці), так і на Захадзе (узнікненне славістыкі). Вялікую ролю адыграла паўстанне 1863 года, якое прыцягнула ўвагу рускіх, польскіх, а пазней і замежных навукоўцаў да лёсу беларускага народа. На Захад сталі пранікаць звесткі пра Беларусь, яе літаратуру і мову, фальклор і гісторыю. У Германіі яны друкаваліся пераважна ў нямецкіх часопісах "Альтпройзішэ монатшрыфт", "Ам урквель", "Глобус", "Ост унд Вест", "Славанка", але болей за ўсё ў "Архіў фюр славішэ філалагі". Шырокае асвятленне на яго старонках атрымалі праблемы беларускай гісторыі, мовы, старажытнай і перакладной літаратуры"[2,153].

"На беларускіх землях утварылася некалькі тэрытарыяльна адасобленых цэнтраў пражывання нямецкага насельніцтва. У XIX ст. найбольш значная ў колькасных адносінах група немцаў пражывала ў раёне Беластока, даволі шматлікая калонія немцаў ўтварылася ў горадзе Віцебску і Віцебскім уездзе. Па перапісу насельніцтва 1897 г. каля дзесяці тысяч немцаў жыло ў тагачаснай Гародзенскай губерніі, больш сямі тысяч у Віцебскай, у Менскай і Магілеўскай губернiях — адпаведна чатыры і дзве тысячы чалавек.

Калі большасць нямецкіх перасяленцаў займалася земляробствам, то немцы Гародзеншчыны спецыялізаваліся на апрацоўцы бавaўняных вырабаў. Наогул жа сярод беларускіх немцаў у другой палове мінулага стагоддзя было шмат аптэкараў, служачых чыгунак, кіраўнікоў маёнткамі і арэндатараў" [3,40-41].

У канцы XIX-пачатку XX ст.ст. напоўніўся новым зместам эканамічны накірунак беларуска-нямецкіх сувязяў.

Фактары, якія абумовілі ролю Беларусі ў германа-расійскіх сувязях таго часу, удала паказаны ў падрыхтаваным кафедрай эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта вучэбным дапаможніку "Эканамічная гісторыя Беларусі". У гэтай кнізе чытаем: "Выгаднае геаграфічнае становішча, адносна шырокая сетка чыгуначнага, воднага і шашэйнага транспарту ператварылі Беларусь у важны рэгіён, які злучаў прамысловыя цэнтры Расійскай імперыі – Польскі, Пецярбургскі, Прыбалтыйскі і Украінскі, з прамыслова развітай Германіяй. Усё гэта давала магчымасць Беларусі ўдзельнічаць у міжнародным падзеле працы і развіваць эканамічныя сувязі як з замежнымі краінамі, так і другімі расійскімі раёнамі"[4,195].

Зразумела, ёсць сэнс звярнуцца да канкрэтыкі. Яна безумоўна ўражвае. "Буйная нямецкая фірма "Фрыц Шульц" (Лейпцыг) вяла лесараспрацоўкі ў 4 маёнтках Бабруйскага павета. У маёнтку Вярхуціна яна пабудавала буйны лесапільна-фанерны завод, на якім працавала больш як 400 рабочых. Нямецкія і аўстрыйскія лесапрамыслоўцы пабудавалі лесапільна-фанерны завод на станцыі Калодзішчы, які перапрацоўваў закупленую на карні драўніну ў Мінскім і Ігуменскім паветах" [4,184].

"На долю Беларусі прыходзілася 54,1 % агульнарасійскага экспарту лесу ў Германію" [4,195].

У пачатку XX стагоддзя немцы трывала мелі сваю нішу ў стракатай карціне рэлігійных канфесіяў Паўночна-Заходняга краю. "У некаторых гарадах меліся лютэранскія кірхі (Менск, Магілёў, Віцебск, Полацк). Пры кірхах меліся прыхадскія школы. Рэлігійнасць спрыяла развіццю такіх традыцыйных форм грамадскай дзейнасці, як дабрачыннасць, аб чым сведчыць, напрыклад, існаванне ў пачатку 1910-ых гадоў у Віцебску Нямецкага дабрачыннага таварыства" [3,41]. Заўважым, што гэта быў першы вопыт нямецкай дабрачыннасці ў дачыненні да беларускага народа.

А зараз ёсць сэнс спецыяльна звярнуцца да кардынальных зменаў, якія адбыліся ў германскай гісторыі апошняй трэці XIX стагоддзя.

Прусія вельмі ўдала выкарыстала тыя спрыяльныя ўмовы для аб'яднання Германіі, якія склаліся ў 50-60-ыя гг. XIX ст. Бліскуча была ажыццяўлена стратэгія, распрацаваная прускім канцлерам О.Бісмаркам. Апошні займаў гэту пасаду з 1862 года. Паспяхова для Берліна скончылася Дацкая вайна 1864 г. і Аўстра-пруская вайна 1866 г. Кануў у лету Германскі саюз. Тэрытарыяльны набытак радзімы Бісмарка склаў 73 тыс. квадратных кіламетраў. На гэтай тэрыторыі пражывала каля 4 мільёнаў чалавек. Выдатным дасягненнем бісмаркаўскай дыпламатыі з'явілася ўзнікненне Паўночнагерманскага саюзу. У яго

склад увайшлі 22 краіны на поўнач ад ракі Майн. Вельмі дарэчы быў ваенны саюз з Баварыяй, Бадэнам, Гесенам, Дармштатам і Вютэнбергам, якога дамогся прускі канцлер.

Заключным этапам барацьбы Бісмарка за аб'яднанне Германії з'явілася франка-пруская вайна 1870-1871 гг. У сферу прускага панавання трапілі Эльзас і Усходняя Латарынгія. З 1871 года пачала адлік свайго існавання Германская імперыя. Яе першым манархам стаў прускі кароль Вільгельм І. Бісмарк разглядаў аб'яднанне Германії як пісьменнік А. Цвейг, паэт О. Вёрле ..., мастацтвазнаўца А. Іпель, этнограф Ф. Куршман"[2,154].

Напрыканцы трэба адзначыць, што знаходжанне тэрыторыі Беларусі ў межах Расіі азначала новы этап і ў беларуска-германскіх сувязях, асабліва ў канцы XIX-пачатку XX ст.ст. Менавіта тады Беларусь стала важным рэгіёнам дынамічных усебаковых зносін краін Усходняй Еўропы. Але, як і раней, у беларуска-нямецкіх адносінах прысутнічаў трагічны фактар, звязаны с падзеямі 1812 г. і першай сусветнай вайны.


1. Грыцкевіч А. Гісторыя геапалітыкі Беларусі. //Спадчына, 1994, №4.
2. Соколовский В.Утверждение исконного. Белорусская культура в немецкоязычном мире. // Нёман, 1995, № 4.
3. Майснер А. Гісторыя асадніцтва і сучасныя праблемы немцаў Беларусі. //Нацыянальныя меншасці Беларусі. Кніга 3. Актуальныя праблемы нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі. Брэст-Мінск, 1996.
4. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік. / Выд.2-е, дап. і перап. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1995.
5. Сідарэвіч А.Беларуская Народная Рэспубліка. /Энцыяклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.Т.1. Мн.: Бел Эн., 1993.
6. Кананович У., Снапкоўскі У.Дыпламатыя. /Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6т. Т.3. Мн.: БелЭн., 1996.


## ГЕРМАНО-ЧЕШСКИЕ МЕЖГОСУДАРСТВЕННЫЕ ОТНОШЕНИЯ КОНЦА XII – ПЕРВЫХ ДЕСЯТИЛЕТИЙ XIII В.


И.М. Лихтей

*г. Ужгород (Украина), УНУ*


На рубеже XII-XIII веков возникла благоприятная международная ситуация для укрепления авторитета Чешского королевства и возрастания его влияния в Центральной Европе (Краткая история Чехословакии, 1988, с. 44.). Немалую роль сыграли при этом такие факторы, как распад англо-французской империи Плантагенетов на западе европейского континента, упадок Византии на востоке и, особенно, усиление власти курфюрстов в Священной Римской империи после смерти в 1197 году немецкого короля и императора Генриха VI Штауфена. Одновременно значительно возрос политический престиж папства (Přehled dějin Československa I/1, 1980, s. 217.). Вследствие стечения обстоятельств в начале 1198 года папский престол занял римский аристократ, выходец из среднеитальянского графского рода Лотарио ди Сеньи Иннокентий III (1198-1216) (Егер, 1997, с. 341.). Человек чрезвычайно энергичный и властолюбивый, он приложил немало усилий для того, чтобы папская курия завоевала гегемонию над всем христианским миром (Колесницкий, 1977, с. 156.).

На время смерти Генриха VI его сыну и наследнику Фридриху II(1194 - 1250), которого еще в 1196 году на Франкфуртском съезде князей признали правителем Сицилийского королевства, не исполнилось даже трех лет. Поэтому на Мюльхаузенском рейхстаге (в марте 1198 г.) немецким королем был избран брат Генриха VI - герцог Филипп Швабский (1198 - 1208), который тем самым нарушил права малолетнего племянника. Таким поступком сразу же воспользовались противники Штауфенов - вельфы, которые стремились увидеть на королевском троне собственного ставленника. После кратковременных поисков эта партия остановила свой выбор на сыне покойного Генри-